УДК 37.036-057.87:398.5(476)

# Беларускі фальклор як сродак фарміравання духоўна-маральнай культуры вучнёўскай і студэнцкай моладзі

*Сусед-Вілічынская Ю. С.*
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава", Віцебск*

*У артыкуле адзначаюцца асаблівасці сацыяльна-педагагічнага праекта "Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя", рэалізацыя якога ажыццяўляецца фальклорным калектывам "Вясёлка" педагагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава" ў садружнасці з узорным фальклорным калектывам "Зорачкі" ДУА "Гімназія № 1 г. Віцебска". Аўтар вылучае канцэптуальныя асновы праектаў "Беларуская хатка" і "Батлейка адчыняе дзверы".*

*У даследаванні разглядаецца фанічная індывідуальнасць галасоў навучэнцаў малодшых класаў і студэнтаў у працэсе фарміравання этнакультуры, аналізуецца магчымасць выкарыстання аўтэнтычнага фальклору сучаснай моладдзю.*

*У публікацыі выяўляюцца магчымасці і перспектывы фарміравання духоўна-маральнай культуры асобы сродкамі беларускай вуснай народнай творчасці на прыкладзе дзейнасці вышэйзгаданых фальклорных калектываў.*

***Ключавыя словы:*** *беларускі фальклор, аўтэнтычны фальклор, духоўна-маральная культура, вучні малодшых класаў і студэнцкая моладзь, сацыяльна-педагагічнае праектаванне, грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, сацыяльна актыўная асоба.*

*(Искусство и культура. – 2018. – № 4(32). – С. 89–97)*

# Belarusian Folklore as a Means of Shaping Spiritual and Moral Culture of School and University Students

*Sused-Vilichynskaya Yu. S.*
*Educational Establishment "Vitebsk State P. M. Masherov University", Vitebsk*

*Features of the social and pedagogical project "XXI Century Youth's Vision of Folk Traditions" are identified in the article. The Project is implemented by the folk group "Viaselka" of the Faculty of Education of Vitebsk State P. M. Masherov University in cooperation with the folk group "Zorachki" of Gymnasium No1 of the City of Vitebsk. The author singles out concept bases of the projects "Belaruskaya Khatka" and "Batleika Adchyniaye Dzveri".*

*Phone individuality of the voices of younger schoolchildren and students in the process of shaping ethnic culture is considered in the research paper, the possibility to apply authentic folklore by the contemporary youth is analyzed.*

*Possibilities and prospects of shaping the personality spiritual and moral culture by means of Belarusian oral folklore on the example of the above mentioned folk groups are identified in the paper.*

***Key words:*** *Belarusian folklore, authentic folklore, spiritual and moral culture, young schoolchildren and university students, social and pedagogical project, social and patriotic education, socially active personality.*

*(Art and Cultur. – 2018. – № 4(32). – P. 89–97)*

Выхаванне маладога пакалення павінна ўключаць дзейнасць па фарміраванні ўменняў карыстацца свабодай, г. зн. самастойна ставіць асабістыя і сацыяльна значныя мэты, праектаваць траекторыю іх дасягнення ва ўсёй сацыяльнай прасторы, прагназаваць магчымыя вынікі, планаваць час, самастойна знаходзіць неабходную інфармацыю і г. д. [1].

Маральнае выхаванне школьнікаў прадугледжвае развіццё духоўна-маральнай сферы, выхаванне дзіцяці думаючым, дабрадзейным, міласэрным, сумленным, працавітым, сціплым, паважлівым і адказным. Выхаванне духоўнай асобы магчыма толькі сумеснымі намаганнямі сям'і, адукацыйнай установы і дзяржавы.

Вызначаючы маральнае выхаванне як мэтанакіраваны працэс далучэння дзяцей да маральных каштоўнасцей чалавецтва і канкрэтнага грамадства, варта звярнуць увагу на традыцыі маральнага выхавання дзяцей на прыкладзе абавязковага шанавання старэйшых. Этнограф П. В. Шэйн, апісваючы побыт беларускага народа ў дарэвалюцыйныя час, адзначыў: "Да старэйшых гадамі, як да суседзяў, сяляне нашы як раней, так і

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: Sused-V62@mail.ru – Ю. С. Сусед-Вілічынская*



Репозиторий ВГУ

Табліца 1 – ***Канцэптуальныя асновы сацыяльна-педагагічнага праекта “Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя”***

| № | Структура | Сутнасць |
|---|---|---|
| 1. | Праблемнае поле | Супярэчнасць паміж уключэннем асоб розных сацыяльных груп у розныя віды і сферы грамадскай практыкі (шляхам фарміравання сацыяльных навыкаў, адпрацоўкі правілаў і нормаў зносін) і іх грамадзянска-патрыятычным выхаваннем на матэрыяле беларускага фальклору |
| 2. | Мэта / прадукт дзейнасці | Фарміраванне сацыяльна актыўнай асобы сродкамі беларускага фальклору / Сацыяльна-педагагічны праект “Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя” |
| 3. | Тэарэтычныя палажэнні | Сацыяльна-педагагічнае праектаванне, грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, сацыяльна актыўная асоба, беларуская народная культура, песенны фальклор |
| 4. | Метадалагічны падыход і прынцыпы, якія яго канкрэтызуюць | Прынцыпы, якія канкрэтызуюць асобасна-дзейнасны і культуралагічны падыходы як абраную аснову (праектавання і пераўтварэння асобы ў дзейнасці, свабоднай самарэалізацыі, актуалізацыі духоўнай культуры як фундаменту самарэалізацыі асобы будучага настаўніка) |

цяпер заўсёды ставіліся і ставяцца з павагаю” [2, с. 49]. Павага да бацькоў, старэйшых па ўзросце, да ўсіх людзей, што знаходзіліся побач, выхоўвалася на працягу многіх стагоддзяў праз асабісты прыклад, апявалася ў песнях, пра яе апавядалася ў казках. Паважлівае стаўленне да людзей з’яўлялася і падмуркам уласнага дабрабыту, бо служыла ажыццяўленню пераемнасці сувязі пакаленняў.

Безумоўна, выкананне беларускіх народных песень і танцаў, выкарыстанне ў педагагічнай дзейнасці розных жанраў вуснай народнай творчасці спрыяюць умацаванню маральных асноў асобы дзіцяці.

Пытанні арганізацыі змястоўнага вольнага часу моладзі, напоўненага грамадска карыснай дзейнасцю (дапамога ветэранам і пажылым людзям, гісторыка-пошукавая і краязнаўчая дзейнасць, шэфская і валанцёрская дапамога), разгледжаны ў працах Г. М. Бяспалавай, А. Я. Бачарова, У. І. Курбатава, В. У. Курбатавай, Т. Г. Новікавай, І. В. Рудэнка, Н. Р. Цімаковай, А. Ф. Ушанава і інш. Атрыманыя вынікі спрыяюць аптымізацыі дзейнасці па рэалізацыі творчага патэнцыялу навучэнскай моладзі, развіццю цікавасці да арганізацыі свайго вольнага часу і дапамагаюць згуртаванню калектыву [3, с. 202].

Ажыццяўленне дадзеных тэарэтычных палажэнняў магчыма ў рамках дзейнасці калектываў мастацкай самадзейнасці. У прыватнасці, узорны фальклорны калектыў “Зорачкі” ДУА “Гімназія № 1 г. Віцебска” і фальклорны калектыў “Вясёлка” педагагічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава рэалізуюць сацыяльна-педагагічны праект “Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя”.

Мэтай гэтага артыкула з’яўляецца фарміраванне сацыяльна актыўнай асобы сродкамі беларускага фальклору.

**Структура сацыяльна-педагагічнага праекта “Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя”.** Пад сацыяльна-педагагічным праектаваннем разумеецца магчымасць пераўтвараць сацыяльныя працэсы, з’явы, умовы з дапамогай педагагічных сродкаў. Кожны сацыяльна-педагагічны праект мае сваю грамадскую місію (прызначэнне). Ён нараджаецца на аснове сацыяльнага прагназавання і прадбачання, арыентаваны на змяненне навакольнага сацыяльнага асяроддзя (сацыяльных умоў) і патрабуе самавызначэння ўдзельнікаў праекта адносна якасці гэтага асяроддзя. Мэтай праекта становіцца ініцыяванне працэсу, здольнага прывесці да пазітыўных змен у сацыяльным асяроддзі. Спецыфічны кантэкст сацыяльна-педагагічнага праекта фарміруе адносіны сацыяльнага партнёрства, пад якім у дадзеным выпадку разумеецца добраахвотнае і раўнапраўнае ўзаемадзеянне ў праектнай сферы розных грамадскіх і дзяржаўных сіл, людзей рознага ўзросту і сацыяльнага статусу.

Асаблівасцям праектнай дзейнасці ў адукацыі прысвечаны шматлікія даследаванні (А. С. Анісімаў, В. С. Бязрукава, Ю. В. Грамыка, В. В. Гузееў, А. С. Заір-Бек, Т. У. Карпінская, Л. М. Кульпіна і інш.). Вялікае значэнне ў іх надаецца працэдуры канцэптуалізацыі, у якую ўваходзяць разумовая дзейнасць па пошуку падстаў для фарміравання ідэальнага

Рэпазіторый ВДУ

ўяўлення аб будучым стане аб'екта і спосабе яго праектавання.

Метадалагічную аснову праекта «Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя» склалі даследаванні па педагагічным праектаванні (І. А. Калеснікава, Б. В. Пальчэўскі, Н. А. Масюкова, Г. П. Шчадравіцкі). Пры распрацоўцы змястоўнага аспекту былі выкарыстаныя працы Т. Б. Варфаламеевай, А. В. Катовіч, І. І. Крука, Г. П. Арловай.

Канцэптуальныя асновы праекта "Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя" можна прадставіць праз наступныя пазіцыі (табл. 1).

Асобасна-дзейнасны падыход прапануе ў якасці вядучага арыенціра фарміраванне асобасных якасцей і накіраванасць педагагічных мер на арганізацыю інтэнсіўнай дзейнасці, якая пастаянна ўскладняецца. Толькі праз дзейнасць чалавек засвойвае навуку і культуру, спосабы пазнання і пераўтварэння свету. Культуралагічны падыход заснаваны на выкарыстанні ў працэсе навучання і выхавання вопыту навучэнца (студэнта) і яго сям'і, на забеспячэнні вядучай ролі сацыякультурнага кантэксту развіцця, актывізацыі дзейнасці навучэнца (студэнта), засваенні знакава-сімвалічнай структуры дзейнасці свайго народа, творчым характары развіцця [4, с. 83].

Сацыяльна-педагагічны праект "Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя" як прадукт дзейнасці прадугледжвае распрацоўку і фіксацыю дзвюх важных пазіцый: рэсурснага забеспячэння і праектаванага выніку.

Рэсурснае забеспячэнне можна прадставіць як сістэму элементаў, якія спрыяюць рэалізацыі праекта (людскія рэсурсы, нарматыўна-прававыя дакументы, метадычныя, тэхніка-метадычныя, фінансавыя, матэрыяльна-тэхнічныя і іншыя рэсурсы). У рамках аб'яднання дзвюх навучальных структур – установы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава" (педагагічны факультэт) і ДУА "Гімназія № 1 г. Віцебска" – мэтазгодна вылучыць наступныя элементы: выкладчыкі, студэнты і гімназісты; студыя гуказапісу кафедры музыкі, у якой адбываецца запіс фанаграм беларускіх народных песень; фота- і відэаапаратура, праграмы для мантажу відэапрэзентацый; віртуальнае асяроддзе (сэрвісныя аб'екты даных) і інтэрнэт-рэсурсы; фонды ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна", навуковай бібліятэкі ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава", ДУ "Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці". Структура рэсурснага забеспячэння прадстаўлена на мал. 1.

Разгледзім некаторыя асаблівасці праектаў "Беларуская хатка" і "Батлейка адчыняе дзверы".




Мал. 1. ***Структура рэсурснага забеспячэння сацыяльна-педагагічнага праекта "Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя"***

Рэпазіторый ВГУ

Пачатак музычна-педагагічнага праекта “Беларуская хатка” датуецца 2011/12 навучальным годам. Мэта гэтага праекта – пазнаёміць дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту і вучняў малодшых класаў з беларускімі народнымі шумавымі інструментамі. Гэтаму папярэднічае завочная экскурсія па залах краязнаўчых музеяў гарадоў Віцебскай вобласці (Глыбокае, Гарадок, Орша).

Звернем увагу на структурныя складнікі названага праекта больш падрабязна. Відэашэраг (відэапрэзентацыя “Са спадчынай продкаў – у будучыню”) прадстаўлены фатаграфіямі прадметаў хатняга ўжытку і беларускіх народных касцюмаў і суправаджаецца кароткай інфармацыяй пра спосабы і магчымасці захавання і прымнажэння народных традыцый. Далей гаворка ідзе пра “Беларускую хатку”, якая створана ў асобным кабінеце на педагагічным факультэце ВДУ імя П. М. Машэрава. У ім знаходзіцца першая пасляваенная мэбля (маленькая шафа для верхняга адзення, прыстасаваная для захоўвання музычна-шумавых інструментаў; тумбачка для посуду і газетніца), гліняныя гарлачы з “фірмовым знакам” ганчароў, якія жылі і працавалі ў Бешанковічах, вугальныя прасы, лапці, калаўрот, верацяно, грэбень для часання лёну і іншыя прадметы народнага побыту.

Асаблівае месца належыць батлейцы і батлеечным лялькам, якія былі зроблены ў рамках дыпломных работ выпускнікамі мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава.

На стварэнне батлеечных лялек (Дзед, Баба, Дамавік, дзяўчына Яніна, юнак Ясь, Цыган, Цыганка, Анёл, Д’ябал, Смерць і інш.) спатрэбілася досыць шмат часу, а таксама значная падрыхтоўка як тэарэтычная, так і практычная. Не прэтэндуючы на падрабязны аналіз працэсу вырабу лялек, варта адзначыць, што гісторыя развіцця беларускай батлейкі старанна вывучалася і студэнтамі педагагічнага, і студэнтамі мастацка-графічнага факультэта. Не засталіся па-за ўвагай батлеечныя фэсты, сусветна вядомы лялечны тэатр С. У. Абразцова, беларускі тэатр “Лялька” ў г. Віцебску, Дзяржаўны тэатр лялек Рэспублікі Беларусь. Памеры лялек, іх выгляд, адзенне, твары, прычоскі і іншыя немалаважныя дэталі абмяркоўваліся з незалежнымі экспертамі, у ролі якіх выступілі супрацоўнікі ДУ “Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. Далейшая апрабацыя праектных ідэй ажыццяўлялася сярод слухачоў курсаў павышэння кваліфікацыі ДУДАД “Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі”. Толькі пасля такой сур’ёзнай падрыхтоўкі лялькі набылі права на існаванне: яны прымаюць актыўны ўдзел у розных канцэртных праграмах, ажываюць у руках студэнтаў педагагічнага факультэта і гімназістаў.

Адным з кульмінацыйных атрыбутаў кабінета з’яўляецца печка, намаляваная на палатне. Яна была створана больш за 25 гадоў таму назад вучнем 11 класа сярэдняй школы № 15 г. Віцебска (цяпер ДУА “Гімназія № 1 г. Віцебска”) Д. Якаўлевым. На яе фоне студэнты педагагічнага факультэта перад відэакамерай выстуквалі рытм беларускай народнай песні “Мікіта”, выкарыстоўваючы такія шумавыя інструменты, як кляшчоткі, бразготку, стукалку, копытца, круцёлку, рубель. А інфармацыя аб традыцыйным духавым музычным інструменце беларуская дуда (аналаг шатландскай і ўкраінскай дуды) пашырае музычны кругагляд дзяцей старэйшага дашкольнага і малодшага школьнага ўзростаў. Відэапрэзентацыя завяршаецца выкананнем першага куплета беларускай народнай песні “Мікіта” на баяне, а гледачы атрымліваюць магчымасць ажыццявіць музычна-рытмічнае суправаджэнне песні дзякуючы выбару шумавых інструментаў па сваім жаданні.

Відэапрэзентацыя “Са спадчынай продкаў – у будучыню” з’яўляецца дадаткам да метадычных рэкамендацый “Мы граем і спяваем!”. Яны адрасаваныя студэнтам педагагічнага факультэта, педагогам устаноў дашкольнай адукацыі і бацькам дзяцей дашкольнага ўзросту. У метадычныя рэкамендацыі ўключаны апісанне музычна-шумавых інструментаў, іх ілюстрацыі, беларускія народныя песні, матэрыялы для дапытлівых і заданні для выканання дзецьмі. Метадычныя рэкамендацыі дапаўняюцца фота-, аўдыё- і відэаматэрыяламі. Гэта дапаможа дарослым пазнаёміць дашкольнікаў з беларускай народнай творчасцю, даведацца шмат новага і цікавага пра музычна-шумавыя інструменты. Пры выкананні развіваючых заданняў разам з дарослымі ў дзіцяці фарміруюцца ўяўленні аб традыцыях беларускага народа [5].

Дадзеная відэапрэзентацыя паспяхова выкарыстоўваецца ў працэсе правядзення майстар-класаў для вучняў малодшых класаў; студэнтаў педагагічнага факультэта (спецыяльнасці “Дашкольная адукацыя”, “Пачатковая адукацыя”, “Алігафрэнапедагогіка”, “Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія”) і факультэта навучання замежных грамадзян; студэнтаў Наўгародскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Мудрага і Маскоўскага дзяржаўнага абласнога ўніверсітэта, якія праходзяць стажыроўку ва ўстанове адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава”.

Рэпазіторый ВДУ




Мал. 2. ***Асноўныя пляцоўкі выступленняў фальклорных калектываў у рамках сацыяльна-педагагічнага праекта***

Такім чынам, фарміраванне духоўна-маральнай культуры асобы сродкамі беларускага фальклору ўяўляе сабой сістэму, якая ўключае наступныя этапы:

1. Далучэнне студэнтаў і вучняў малодшых класаў да рэпетыцыйнага працэсу, накіраванае на асэнсаванне, захаванне і інтэрпрэтацыю беларускіх народных традыцый.

2. Канцэртная дзейнасць ва ўстановах адукацыі і ва ўстановах сацыяльнай абароны насельніцтва ў рамках грамадзянска-патрыятычнага выхавання розных сацыяльных груп насельніцтва і папулярызацыі беларускіх народных традыцый.

3. Рэфлексіўнае асэнсаванне дзейнасці студэнтамі-ўдзельнікамі фальклорнага калектыву “Вясёлка” і навучэнцамі-ўдзельнікамі ўзорнага фальклорнага калектыву “Зорачкі” ў працэсе канцэртных выступленняў і непасрэдных кантактаў з гледачамі.

Удзел у сацыяльна-педагагічным праекце вучняў пачатковай школы, якіх досыць складана аднесці да моладзевай узроставай катэгорыі, можа быць апраўданы іх перспектыўным пераўвасабленнем. Акрамя таго, у народных традыцыях здаўна існавала сувязь пакаленняў у перадачы жыццёвага і прафесійнага вопыту.

Асноўныя пляцоўкі выступленняў фальклорных калектываў у рамках сацыяльна-педагагічнага праекта “Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя” прадстаўлены на мал. 2.

Канцэртныя праграмы і выступленні, распрацаваныя для розных сацыяльных груп, прадугледжваюць не толькі адаптаваныя сцэнарыі, але і адпаведнае афармленне (касцюмы, музычнае і тэкставае суправаджэнне і г. д.). Але самае галоўнае, што настройвае аўдыторыю на пазітыўнае ўспрыманне сцэнічнага дзеяння, – гучанне народнага голасу, якое фарміруецца і ўдасканальваецца ў працэсе работы па вызначаных пазіцыях.

**Фанічная індывідуальнасць галасоў навучэнцаў малодшых класаў і студэнтаў у працэсе фарміравання этнакультуры.** Па вызначэнні Тлумачальнага слоўніка рускай мовы [6] слова “фанізм” паходзіць ад грэчаскага *phõnë* – гук (псіхалогія) і азначае ўзнікненне пэўных слыхавых уяўленняў у выніку аптычных і іншых, не акустычных, уражанняў. Музычная энцыклапедыя прапануе наступную фармулёўку тэрміна “фанізм”: “Гэта фарба (ці характар) гучання акорда самога па сабе, незалежна ад яго танальна-функцыянальнага прызначэння. Фанізм можа быць уласцівы і спалучэнню акордавых гукаў з неакордавымі” [7].

Як вядома, пачатак тэорыі фанізму сугуччаў пакладзены “Вучэннем аб гармоніі” Ю. М. Цюліна, а таксама іншымі яго працамі. Фанізму ўдзяляюць увагу Л. А. Мазель, Ю. М. Халопаў, С. С. Грыгор’еў, Б. М. Цяплоў. А ў манаграфіі Я. У. Назайкінскага “Гукавы свет музыкі” фанізм разглядаецца ў кантэксце трыяды “тэмбр–фанізм–санорнасць”.

Ёсць магчымасць вызначыць тры асноўныя палажэнні, на якія настаўнікі музыкі і кіраўнікі фальклорных калектываў павінны перш за ўсё звярнуць увагу:

1. Паняцці тэмбру, фанізму і санорнасці адлюстроўваюць тыя розныя грані слыхавога

Рэпазіторый ВДУ

свету, якія былі ахарактарызаваны ў сувязі з адрозненнем гуку, тону і ноты.

2. Вышынная акрэсленасць гуку з'явілася зыходным момантам з'яў фанізму.

3. Як слыхавы феномен, які прыцягвае ўвагу, фанізм узнік, як відаць, вельмі даўно ў практыцы шматгалосся народнай музыкі, у прыкладных жанрах. У народнай інструментальнай музыцы вялікія магчымасці для ўсведамлення фанічных эфектаў давалі валыначныя, бурдонныя гукі [8, с. 35].

Таксама вялікую ролю адыгрывае паняцце "фанічная індывідуальнасць". На думку Я. У. Назайкінскага, яно мае якасны, а не колькасны характар, таму апісанне фанічнага абрысу тону, сугучча, танальнасці заўсёды аказваецца прыблізным і апялюе да вобразных аналогій, метафар, сінэстэтычных характарыстык. Больш за тое, фанізм з'яўляецца вынікам інтанацыйна дыферэнцыраванай вышыннасці гукаў і гукавых комплексаў, паралельным вынікам, які паўстае, як правіла, не ў якасці самастойнай мэты. На першым плане тут знаходзіцца ладавая, інтанацыйна-меладычная і гарманічная логіка, якая патрабуе яснага ўспрыняцця ўсіх вышынных элементаў. Пры гэтым непазбежна нараджаюцца фанічныя эфекты [8, с. 40–41].

На наш погляд, гэтыя тэарэтычныя палажэнні атрымліваюць значную ролю ў фарміраванні этнакультуры малодшых школьнікаў і студэнцкай моладзі.

Звернем увагу на змест і сэнс моўнай часткі "этна". Гэтым тэрмінам звычайна абазначаюць арыентацыю на нацыянальныя (этнічныя) традыцыі мастацкіх рамёстваў і народнага мастацтва розных краін. У народных вырабах (матэрыяльныя рэчы) "дажываюць" сваю шматвяковую гісторыю старажытныя арнаменты і сімвалы, прыёмы ручной апрацоўкі матэрыялаў, якія нарадзіліся ў даіндустрыяльную эпоху.

У сувязі з гэтым асаблівую ўвагу трэба звярнуць на функцыянаванне механізмаў фарміравання, замацавання, захавання і аднаўлення (актуалізацыі) гукавой семантыкі[1]. Яны ахопліваюць як індывідуальныя, уласныя жыццёвыя запатрабаванні чалавека, фарміруючы змястоўны слоўнік разнастайных гукавых асацыяцый, так і сацыяльны, гістарычны, нарміраваны вопыт, які перадаецца ў тых ці іншых формах кожнаму члену грамадства.

Акрамя таго, гукавыя значэнні і сэнс абслугоўваюцца некалькімі сістэмамі памяці, сярод якіх акрамя непасрэдных пачуццёвых уяўленняў аб гучанні, тэмбрах і іх характары, звязаных з неўралагічнымі структурамі, вялікую ролю адыгрываюць таксама і знешнія віды памяці. Да апошніх адносіцца своеасаблівая агульнамастацкая, культурная памяць, якая нярэдка вызначаецца фармулёўкай "культура як памяць" [8, с. 160].

**Аўтэнтычны фальклор і сучасная моладзь.** Тэрмін "аўтэнтычны фальклор" не вельмі часта выкарыстоўваецца ў метадычнай літаратуры, прызначанай для дапамогі настаўнікам і выкладчыкам, таму змест гэтага паняцця нярэдка скажаецца. Паняцце "аўтэнтычны" паходзіць ад грэчаскага *authentikos* і азначае сапраўдны, правільны, які адпавядае арыгіналу. Зыходзячы з гэтага, галоўным напрамкам работы фальклорнага калектыву павінен з'яўляцца мясцовы матэрыял з першакрыніц. Этнаграфічныя раёны Віцебшчыны выступаюць цэнтрам паўночнабеларускай культуры, якая мае глыбокія агульнаславянскія традыцыі і разам з гэтым вызначаецца ярка акрэсленымі рэгіянальнымі асаблівасцямі. Як адзначае З. Я. Мажэйка, фальклорная спадчына Віцебшчыны вывучана ў цэлым даволі грунтоўна. Шырока вядомы грамадскасці навукова-даследчыя працы і этнафальклорныя зборы Я. Баршчэўскага, М. Я. Нікіфароўскага, М. М. Нікольскага, Е. Р. Раманава, С. П. Сахарава, П. В. Шэйна, А. А. Шлюбскага. Менавіта іх даследаванні могуць стаць асновай для вывучэння аўтэнтычнага фальклору Віцебшчыны.

Для вызначэння асаблівасцей народна-песеннай культуры трэба зноў звярнуцца да прац З. Я. Мажэйка. Характарызуючы народна-песенную культуру Паазер'я, яна адзначае наступныя асаблівасці. Па-першае, культура гэта цалкам манадыйная, заснаваная на "чыста" лінеарным мысленні, на самадастатковым значэнні ўласна меладычнага пачатку. У народным побыце паўночнабеларускіх рэгіёнаў пануе адзіночнае або сумеснае спяванне аднагалосных мелодый ва ўнісон (часам толькі з невялікімі эпізадычнымі расслаеннямі галасоў у некаторых абрадавых і лірычных напевах). Другая вызначальная асаблівасць народна-песеннай культуры Паазер'я заключаецца ў шматграннасці абраднасці і надзвычайнай лакальнай варыятыўнасці асобных яе элементаў, якія прама або апасродкавана ўплываюць на тыпалогію каляндарна-земляробчых і сямейна-абрадавых напеваў. Менавіта гэта асаблівасць і садзейнічала выключна буйному росквіту на Паазер'і лаканічных абагульненых напеваў, строга прымеркаваных да абраду, пэўнага часу або абставін [9]. Народная манера спеваў складаецца са шматлікіх элементаў: дыхання, гукаўтварэння, інтанацыі, дыкцыі,

[1]Семантыка – раздзел семіётыкі, які вывучае знакавыя сістэмы як сродак выражэння сэнсу.

Рэпазіторый ВДУ

Табліца 2 – ***Этапы падрыхтоўкі і правядзення спектакля***

| Этап | Сутнасць | Асаблівасці |
|---|---|---|
| Падрыхтоўчы | Стварэнне сцэнарыя тэатральнага або агітацыйна-мастацкага дзейства і партытуры музычнага суправаджэння | Гэты творчы этап даволі працаёмкі ў сэнсе затрат часу, духоўных сіл, а ў асобных выпадках і матэрыяльных сродкаў |
| Асноўны | Размеркаванне сцэнічных роляў і развучванне іх для дасягнення максімальнай выразнасці дэкламацыі і дзеяння | Работа па засваенні зместу сцэнарыя і партытуры (ад першага і да апошняга знакаў – слоў і нот) праводзіцца непасрэдна на занятках фальклорнага калектыву і навучальнаму працэсу не перашкаджае. Вядома, гэта спрыяе выхаванню адказнасці |
| | Фальклорны аркестр развучвае змест і паслядоўнасць музычнага суправаджэння выступленняў вакальна-танцавальнай групы | |
| Заключны | Ажыццяўляецца аб'яднанне ў адзінае цэлае разрозненых элементаў спектакля, якімі паасобку авалодала кожная група | Сцэнарных варыянтаў шмат, але кожны з іх абавязкова павінен несці ў сабе выразны духоўны і выхаваўчы пачатак, які можа праявіцца і ў сур'ёзнай, і ў жартаўлівай форме |

артыкуляцыі, дыялекту і інш. Але спецыфіка народных спеваў недастаткова адлюстроўваецца ў навукова-метадычнай літаратуры. У работах А. М. Аляхновіча, З. Я. Мажэйка, І. І. Сучкова не толькі закранаюцца агульныя пытанні гэтай праблемы, але і пададзены вельмі карысныя практычныя парады. Напрыклад, на ўроках музыкі, асабліва ў вясковай школе, важна выкарыстоўваць узоры мясцовага фальклору, запрашаючы на заняткі непасрэдна носьбітаў традыцый.

Каб зварот да народных вытокаў, асэнсаванне народнай спадчыны не выглядалі як нейкі анахранізм (на жаль, прыярытэты большай часткі моладзі аддаюцца сучаснай масавай культуры), шлях да народнай песні і абрадавых дзеянняў можа суправаджацца элементамі сучаснага жыцця. Таму Каляды пачынаюцца з невялікай прамовы: "Шаноўнае спадарства! Мы з Вамі жывём ужо ў XXI стагоддзі на нашай прыгожай і шчырай, добразычлівай і гасціннай Зямлі. Ідзе час... Змяняецца аблічча нашых гарадоў і вёсак, моладзь апранаецца ў іншае, чым у мінулым стагоддзі, адзенне, слухае зусім не тую музыку, якая падабалася іх бацькам, імкнецца да больш напружаных рытмаў. І таму вядомы абрад «Каляды» з пункту погляду жыхароў XXI стагоддзя падаецца ў сучасных рытмах і ў незвычайным апрананні". Так, "мядзведзь" танцуе брэйк-данс, "цыган" спявае аўтарскую песню "Аб добрым харчаванні", "козлік" у час вітання робіць акрабатычныя трукі ці танчыць брэйк-данс.

Спектакль як асноўная форма дзейнасці фальклорных калектываў аб'ядноўвае песенны, тэатральны і агітацыйна-мастацкі накірункі. А пастановачны матэрыял – п'еса – створаны з улікам магчымасцей, здольнасцей і патрабаванняў удзельнікаў калектываў, а таксама ўзроўню іх арганізаванасці. Працэс падрыхтоўкі спектакля фальклорнага калектыву прадстаўлены ў табл. 2. Трэба ўлічваць прынцыпы асобаснай арыентацыі і гульнёвай дзейнасці падчас рэалізацыі пэўных сцэнарыяў (народныя абрады і святы, інсцэніроўкі казак і г. д.).

Асобасная арыентацыя працэсу пастаноўкі спектакля (канцэртнай праграмы) прадстаўлена дыялагічнасцю, дзейнасна-творчым характарам, скіраванасцю на падтрымку індывідуальнага развіцця ўдзельніка калектыву, прадастаўленне яму неабходнай самастойнасці па выбары зместу і спосабаў навучання і паводзін, а таксама для прыняцця асабістых рашэнняў.

Крытэрыямі асобаснай арыентацыі з'яўляюцца ўзровень агульнага развіцця і культуры выканаўцы, а таксама валоданне ведамі ў пэўнай галіне; асаблівасці псіхічнага развіцця, характару і тэмпераменту асобы. Згаданыя параметры і крытэрыі выкарыстоўваюцца не толькі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, але і ў пазакласнай дзейнасці. Неабходна таксама звярнуць увагу на выкарыстанне суб'ектыўнага вопыту жыццядзейнасці ўдзельнікаў фальклорных калектываў, развіццё іх пазнавальных здольнасцей, магчымасцей самавызначэння і самарэалізацыі ў разнастайных умовах.

Рэпазіторый ВГУ

Работа творчага калектыву ацэньваецца па розных крытэрыях, якія ўлічваюць колькасць / лік удзельнікаў, якасць выступленняў на разнастайных конкурсах, інтэнсіўнасць канцэртнай дзейнасці, ступень крэатыўнасці кіраўніка. Выкананне беларускіх народных песень і танцаў, зварот да вуснай народнай творчасці спрыяюць узмацненню патрыятызму. Аднак выкарыстанне толькі народнай спадчыны недастаткова для станаўлення асобы грамадзяніна роднай краіны. Літаратура і мова, філасофія і гісторыя, сямейнае выхаванне, асяроддзе, у якім выхоўваюцца ўдзельнікі калектываў, спрыяюць глыбокаму засваенню грамадзянскіх каштоўнасцей.

У сувязі з гэтым адзначым некаторыя асаблівасці дзейнасці вышэйзгаданых фальклорных калектываў. Фальклорны калектыў "Зорачкі" ДУА "Гімназія № 1 г. Віцебска" быў створаны ў 1989–1990 навучальным годзе настаўніцай музыкі Ю. С. Сусед. Першы склад удзельнікаў налічваў 42 артысты ва ўзросце ад 9 да 17 гадоў. Першы год работы калектыву азнаменаваўся шматлікімі выступленнямі на выбарчых участках, на фальклорным свяце ў Палацы культуры ўпраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва, у Віцебскім дзяржаўным ветэрынарным інстытуце, на творчых сустрэчах настаўнікаў рэспублікі, на Віцебскім абласным тэлебачанні (перадача "Свет тваіх захапленняў"). Акрамя канцэртнай дзейнасці ўдзельнікі фальклорнага калектыву актыўна цікавіліся гісторыяй і культурай Беларусі: наведвалі музеі г. Віцебска, сустракаліся з носьбітамі беларускай культуры, зрабілі экскурсійную паездку ў г. Мінск, дзе пазнаёміліся з экспазіцыяй этнаграфічнага музея пры Акадэміі навук БССР.

У 1995 годзе адбылося знаёмства з Н. Р. Ільіной, дачкой віцебскага казачніка Р. Л. Шакулава, казкі якога "Фенік-Ур і Рандачка", "Пяць пеўнікаў", "Тапалёк і лебяда" ўвайшлі ў рэпертуар калектыву. У музычным афармленні гэтых казак гучалі фальклорныя творы Віцебшчыны. З таго часу "Зорачкі" ўзялі на сябе ролю прапагандыста творчасці Р. Л. Шакулава. Усіх удзельнікаў калектыву аб'ядноўвае агульнае: любоў да фальклорнай спадчыны, жаданне ведаць свае карані, зрабіць уласнае жыццё больш яркім і насычаным, прыносіць людзям сваімі выступленнямі радасць і добры настрой. У працы фальклорнага калектыву "Зорачкі" выкарыстоўваюцца розныя фальклорныя жанры: песенна-інструментальны фальклор, вусная народная творчасць (казкі, паданні, прыказкі, прымаўкі і г. д.), танцавальныя імправізацыі і аранжыроўкі. Прысутнічае і асабістая інтэрпрэтацыя народнай творчасці.

Рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (№ 102 ад 29.09.2006 г.) фальклорнаму калектыву "Зорачкі" прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь". На працягу існавання калектыву з'явіўся яго ўласны стыль, які вызначаецца даследаваннем і выкарыстаннем аўтэнтычнага фальклору Віцебшчыны, стылізацыяй фальклорных твораў. Адзін з вынікаў гэтай дзейнасці – распрацоўка эскізаў і стварэнне эксперыментальнага асобніку жаночага і мужчынскага адзення.

Псіхолага-педагагічнае суправаджэнне дзейнасці калектыву грунтуецца на наступных прынцыпах:

– культуралагічная накіраванасць навучання і выхавання;

– сувязь з жыццём, народнымі традыцыямі;

– адзінства фарміравання ведаў і ўменняў, разумення і паводзін;

– навучанне і выхаванне ў калектыве;

– пераемнасць і сістэматычнасць;

– эстэтызацыя.

Фальклорны калектыў "Зорачкі" мае яшчэ адну незвычайную асаблівасць. Безумоўна, юныя артысты цікавяцца вынікамі свайго ўдзелу ў розных мерапрыемствах, конкурсах, аглядах мастацкай самадзейнасці. Але галоўнае для ўсіх удзельнікаў, як высветлілася на працягу гадоў, – гэта сам калектыў, тое, чым юныя артысты займаюцца ў час уласных рэпетыцый і выступленняў, той эмацыянальны фон, які прысутнічае пры наведванні відовішчаў сяброўскіх калектываў, тая пазнавальная атмасфера, якая ўзнікае ў час экскурсійных падарожжаў па Беларусі.

Фальклорны калектыў "Вясёлка" педагагічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава быў створаны ў 2011/2012 навучальным годзе. Жанравыя напрамкі – народныя спевы, вусная народная творчасць. Мастацкі кіраўнік калектыву – кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры музыкі Ю. С. Сусед-Вілічынская. Асноўны склад калектыву налічвае 7 чалавек (столькі ж, колькі колераў у вясёлцы), у залежнасці ад праграмы выступленняў колькасць выканаўцаў змяняецца ў бок павелічэння. Для акампанементу выкарыстоўваюцца музычныя інструменты (баян, скрыпка, цымбалы) і музычна-шумавыя інструменты. Рэпертуар калектыву заснаваны на беларускіх народных песнях, аўтэнтычным фальклоры Віцебскага рэгіёна і абрадавых сцэнарах у аўтарскай інтэрпрэтацыі кіраўніка калектыву. Мэтай дзейнасці фальклорнага калектыву "Вясёлка" з'яўляецца асэнсаванне асноў традыцыйнай беларускай культуры, працэсаў яе станаўлення і развіцця. Дадзеная мэта



Рэпазіторый ВДУ

рэалізуецца ў кантэксце рашэння наступных задач:

– выхаванне студэнцкай моладзі не толькі на культурных традыцыях усёй Беларусі, але і канкрэтна на традыцыях Паазер'я ў рамках выкарыстання аўтэнтычнага фальклору Віцебшчыны;

– развіццё вакальных здольнасцей удзельнікаў калектыву, набыццё навыкаў спеваў у народнай манеры.

Калектыў прымае ўдзел у абласных, рэспубліканскіх і міжнародных аглядах, конкурсах, канферэнцыях і фестывалях. У кастрычніку 2017 г. у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка адбыўся Рэспубліканскі семінар-практыкум для кіраўнікоў калектываў фальклорна-этнаграфічнай скіраванасці "Народнае мастацтва: жывая традыцыя і творчы эксперымент у падрыхтоўцы спецыяліста". Прадстаўленыя відэаматэрыялы (інструментальнае папуры на тэмы беларускіх народных песень, "Урачыстая прывітальная" (сл. Г. Главацкай, муз. Ю. Сусед-Вілічынскай), відэапрэзентацыя "Са спадчынай продкаў – у будучыню") размешчаны на афіцыйным сайце Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі (artviva.by).

У студзені 2018 г. фальклорны калектыў "Вясёлка" разам з салістамі Студыі эстраднай песні "Шанец" (кіраўнік – старшы выкладчык А. А. Кушчына) у складзе дэлегацыі педагагічнага факультэта прыняў удзел у фестывалі каляднных традыцый "Светлы вечар" у горадзе Вялікі Ноўгарад (Расія) і быў адзначаны дыпломам лаўрэата.

**Заключэнне.** Матывацыя ў студэнтаў педагагічнага факультэта і малодшых школьнікаў цікавасці да песеннага і танцавальнага беларускага фальклору, развіццё музычных здольнасцей (ладавае пачуццё, музычна-слыхавыя ўяўленні, музычна-рытмічнае пачуццё, музычная памяць), уменняў і навыкаў выканання ў народнай (аўтэнтычнай) манеры, набыццё вопыту творчай дзейнасці і публічных выступленняў спрыяюць фарміраванню сацыяльна актыўнай асобы сродкамі беларускага фальклору ў рамках сацыяльна-педагагічнага праекта "Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя".

Такім чынам, поспех працы творчых калектываў грунтуецца на наступных ідэях:

– грамадска-патрыятычнае выхаванне вучнёўскай моладзі мае розныя накірункі і прадугледжвае праектаванне пэўных вынікаў пры ўмове сумеснай дзейнасці;

– творчы працэс успрымання народных традыцый і абрадаў заснаваны на індывідуальнай асобаснай арыентацыі і гульнёвай дзейнасці;

– сцэнічнае дзеянне прадугледжвае не толькі разнастайныя песенныя, танцавальныя і драматычныя формы работы, але і непасрэдны кантакт з гледачом.

Толькі пры адзінстве вышэйпералічаных пазіцый у разуменні гімназістаў і студэнтаў фарміруецца пазітыўнае ўспрыманне жыцця, адбываецца аднаўленне падзей, фактаў, аспектаў паводзін на ўзроўні генетычнай памяці, што не можа не прывесці да фарміравання духоўна-маральнай культуры і выхавання асобы грамадзяніна і патрыёта сваёй Радзімы. Гэта патрабуе не толькі разумення вытокаў традыцыйнай культуры, працэсаў яе станаўлення і развіцця, але і прадугледжвае стварэнне пэўных псіхолага-педагагічных умоў для засваення традыцый беларускага народа ў працэсе жыццядзейнасці сучаснай моладзі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Моисеев, А. С. Психологический подход к определению понятия «социальная активность» [Электронный ресурс] / А. С. Моисеев. – Режим доступа: http://psyjournals.ru/files/63212/16_Moiseev.PDF. – Дата доступа: 10.03.2015.

2. Арлова, Г. П. Беларуская народная педагогіка / Г. П. Арлова. – Мінск: Нар. асвета, 1993. – 120 с.

3. Сусед-Виличинская, Ю. С. Концептуально-содержательные и методологические аспекты социально-педагогического проекта «Народные традиции глазами жителей XXI века» / Ю. С. Сусед-Виличинская // Наука – образованию, производству, экономике: материалы XIX (66) Регион. науч.-практ. конф. преподавателей, науч. сотрудников и аспирантов, Витебск, 12–13 марта 2015 г.: в 2 т. / Витеб. гос. ун-т; редкол.: И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2015. – Т. 2. – С. 202–204.

4. Сусед-Виличинская, Ю. С. Музыкально-педагогическое проектирование: учеб. пособие / Ю. С. Сусед-Виличинская. – Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова, 2017. – 155 с.

5. Сусед-Виличинская, Ю. С. Мы играем и поём!: метод. рекомендации / Ю. С. Сусед-Виличинская. – Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова, 2013. – 31 с.

6. Фонизм // Толковый словарь русского языка / гл. ред. проф. Б. М. Волин и проф. Д. Н. Ушаков. – М.: Государственное издательство иностранных и национальных словарей, 1940. – Т. 4. – Стб. 1098.

7. Фонизм // Музыкальная энциклопедия / гл. ред. Ю. В. Келдыш. – М.: Советская энциклопедия, 1981. – Т. 5. – Стб. 865.

8. Назайкинский, Е. В. Звуковой мир музыки / Е. В. Назайкинский. – М.: Музыка, 1988. – 254 с.

9. Можейко, З. Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: опыт системно-типологического исследования / З. Я. Можейко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 247 с.

*Паступіў у рэдакцыю 12.09.2018 г.*

Рэпазіторый ВДУ